ПАДЗЕЯ

# СЯБРУЕМ СУСВЕТАМІ

**20 лістапада дэлегацыя пісьменнікаў Гродзеншчыны наведала Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт і паўдзельнічала ў доўгатэрміновым праекце «Літаратурныя ўніверсітэты». Ініцыятар і куратар праекта – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, член СПБ Аліна Сабуць.**




Сустрэчы студэнтаў-купалаўцаў з сучаснымі літаратарамі Прынёмання ў ВНУ адбываюцца рэгулярна ўжо шмат гадоў. На працягу ўжо больш за сем гадоў на філалагічным факультэце рэалізуецца ўнікальная ініцыятыва навукоўцы і педагога, літаратара, крытыка, грамадскага дзеяча Аліны Эдмундаўны Сабуць. Мэты ініцыятывы высакародныя і вельмі карысныя для культуры і навукі – скараціць адлегласць паміж кнігай і маладым, адукаваным чытачом, даследчыкам мастацтва; падтрымліваць цікавасць да сённяшняга дня айчыннай літаратуры; злучыць тэарэтычныя веды з практычным вопытам. Красамоўны факт: у ліку гасцей, удзельнікаў праекта заўсёды прысутнічаюць выпускнікі альма-матэр. Полілог (*ад грэчаскага: polys – шматлікі і lógos – гаворка. Размова, гутарка паміж многімі асобамі; другое значэнне – шматгалоссе*) – такім навуковым тэрмінам традыцыйна вызначаецца сяброўская гутарка пісьменнікаў з моладдзю на тэмы блізкія і зразумелыя прадстаўнікам розных пакаленняў, людзям, якіх аб’яднала шчырая любоў да прыгажосці роднага мастацкага слова, стваральнай працы, да роднай культуры, любоў да жыцця…




У гэты лістападаўскі дзень Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы наведала дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі на чале са старшынёй, заслужаным дзеячам культуры Беларусі Людмілай Антонаўнай Кебіч. У дэлегацыю ўвайшлі: намеснік старшыні, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык; паэт, публіцыст, аўтар і выканаўца песень Андрэй Татур (Гродна), паэт Руслан Півавараў (Ліда); паэтэса Таццяна Яцук (Навагрудскі раён, Баранавічы). Фармат сустрэчы (або яе жанр як мастацтва камунікацыі) – брыфінг-дыялог. Тэма: «Разуменне літаратурнага працэсу. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка. Літаратурныя сувязі». Агучыла тэму Аліна Эдмундаўна, я на ж выканала ролю вядучай мерапрыемства.

Лідар абласной пісьменніцкай арганізацыі Людміла Антонаўна Кебіч па чарзе прадставіла гасцей. Кожны атрымаў сваю хвіліну славы і не толькі. Пісьменнікі запрасілі студэнтаў на афіцыйны інтэрнэт-сайт пісьменніцкай арганізацыі вобласці www.pisateli.by, пазнаёмілі гаспадароў з шэрагам адкрытых асветніцкіх праектаў («Літаратурныя ўніверсітэты» – адзін з іх), літаратурных конкурсаў (якіх сёння нямала менавіта для моладзевай аўдыторыі). Прагучалі пытанні ад моладзі. Адказы на іх атрымаліся вельмі змястоўнымі, таму што былі падмацаваныя аўтарскімі, пераважна паэтычнымі творамі, якія таксама прагучалі падчас брыфінг-дыялогу на філфаке. Прадметамі гутаркі сталі культура творчасці, адказнасць творцы, традыцыі і наватарства; натхненне і іншыя ўмовы творчага працэсу; літаратурная крытыка; такія паняцці, як аўтарскі стыль, вобраз лірычнага героя і іншыя. Сустрэча атрымалася не толькі літаратурнай, але і музычнай, песеннай. Свой песенны твор пад гітарны акампанемент – кранальную філасофскую баладу пра няўмольны час і веліч слова – выканаў для прысутных Андрэй Татур. Гутарка была напоўнена даверам і ўзаемнай сімпатыяй, гучалі апладысменты. Аўтару найбольш цікавага пытання Аліна Эдмундаўна падарыла экземпляр сваёй кнігі. Напрыканцы мерапрыемства госці і гаспадары разам сфатаграфаваліся на памяць.



Па традыцыі вынікам чарговага этапу праекта Аліны Сабуць «Літаратурныя ўніверсітэты» – формы супрацоўніцтва Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі – стануць пісьмовыя рэфлексіі, даследчыя працы будучых філолагаў.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** дэлегацыя пісьменнікаў Гродзеншчыны паўдзельнічала ў доўгатэрміновым праекце «Літаратурныя ўніверсітэты», ініцыятар і вядучая кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, член СПБ Аліна Сабуць. Гродна, галоўны корпус ГрДУ імя Янкі Купалы. 20 лістапада 2025 года.








Людміла Антонаўна расказала пра дзейнасць абласной пісьменніцкай арганізацыі




Старшыня ГрАА СПБ Л. А. Кебіч прадставіла членаў пісьменніцкай дэлегацыі


РАЗУМЕННЕ ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ.
ЭСТЭТЫКА ЛІТАРАТУРЫ.
ПАЭТЫКА.
ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ.
(БРЫФІНГ-ДЫЯЛОГ З ПІСЬМЕННІКАМІ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ)
20.11.2025


ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ.
(БРЫФІНГ-ДЫЯЛОГ З ПІСЬМЕННІКАМІ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ)
20.11.2025






На пытанне адказвае паэт з Ліды Руслан Піваварaў



А. Э. Сабуць







Андрей Татур: «Каждое слово – золото.. Каждое слово – истина…»


ЭСТЭТЫКА ЛІТАРАТУРЫ.
ПАЭТЫКА.
ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ.
(БРЫФІНГ-ДЫЯЛОГ З ПІСЬМЕННІКАМІ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ)
20.11.2025


РАЗУМЕННЕ ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ.
ЭСТЭТЫКА ЛІТАРАТУРЫ.
ПАЭТЫКА.
ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ.
(БРЫФІНГ-ДЫЯЛОГ З ПІСЬМЕННІКАМІ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ)
20.11.2025





РАЗУМЕННЕ ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ.
ЭСТЭТЫКА ЛІТАРАТУРЫ.
ПАЭТЫКА.
ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ.
(БРЫФІНГ-ДЫЯЛОГ З ПІСЬМЕННІКАМІ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ)
20.11.2025



Андрэй Татур,
Дзмітрый Радзівончык,
Таццяна Яцук,
Руслан Піваварaў




Выступае Таццяна Яцук






Чым слова наша адгукнецца?..



Гучыць пытанне па тэме



Выступае Людміла Кебіч






РАЗУМЕННЕ ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ,
ЭСТЭТЫКА ЛІТАРАТУРЫ,
ПАЭТЫКА,
ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ

Усе разам




Дэлегацыя ГрАА СПБ у гасцях у філфака ГрДУ імя Янкі Купалы

